***К.С. Балазечко***

БГЭУ (Минск)

# МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ: ЯК ЦЕСНА ЎСЕ ПЕРАПЛЯЛОСЯ

Міхась Зарэцкі – адзін з лепшых беларускіх савецкіх празаікаў даваеннай пары; па характары творчасці – пераважна рамантык.

У беларускай літаратуры 20-30-х гадоў XX ст. творчасць Міхася Зарэцкага займае адно са значных месцаў. Таленавіты навеліст, раманіст, драматург, крытык. Ён імкнуўся спасцігнуць праўду «новага» часу, паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці – праўду, выпакутаваную глыбокім роздумам над сутнасцю гістарычнага моманту, над лёсам чалавека.

З поўным правам Міхася Зарэцкага можна аднесці да першаадкрывальнікаў новых тэм і праблем у беларускай літаратуры. Менавіта эпоха рэвалюцыйных змен была важным арыенцірам у мастацкім асэнсаванні жыцця, у выпрацоўцы ўласнай гуманістычнай канцэпцыі, скіроўвала ўвагу на духоўныя праблемы часу.

Прыроджаны талент хлопчыка выявіўся ўжо ў раннім узросце, калі ён навучыўся граць на многіх музычных інструментах. Творчы рост Зарэцкага-пісьменніка на пачатку 1920-х гадоў быў надзвычай імклівы.

Прыкладам паспяховага авалодання пісьменнікам буйной эпічнай формай стала аповесць «Голы звер» (1926), раманы «Сцежкі-дарожкі» (1928) і «Вязьмо» (1932). У іх узнімаліся складаныя праблемы маральна-этычнага плана, з пазіцый гуманізму асэнсоўваліся падзеі рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, класавай барацьбы. Пісьменнік не мог змірыцца з той калянасцю, бязлітаснасцю, неапраўданымі ахвярамі, якімі суправаджалася станаўленне савецкай улады і якія мелі месца пры правядзенні суцэльнай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак.

Міхась Зарэцкі прымаў актыўны ўдзел у тэатральнай дыскусіі 1928 гада, якая атрымала шырокі рэзананс у друку. Разам з Т. Глыбоцкім і З. Жалудовічам ён горача выступаў супраць нацыянальнага нігілізму, заклікаў развіваць нацыянальную куьтуру як форму выяўлення духоўнай сутнасці народа,

уключаць у рэпертуар беларускіх тэатраў творы, звязаныя з нацыянальнай традыцыяй, з яе народнымі формамі жыцця.

Аддаючы даніну часу, пісьменнік вымушаны быў кіравацца агульнапрынятымі падыходамі пры мастацкім асвятленні грамадскіх праблем.

Ён імкнуўся спалучаць сацыяльныя праблемы часу з духоўнымі памкненнямі чалавека, з яго светаадчуваннем, з адносінамі да вечных каштоўнасцей жыцця.

Верны гуманістычным прынцыпам, Міхась Зарэцкі бескампрамісна адстойваў правы чалавека на вартае жыццё, рашуча выступаў супраць гвалту. Як мастак, Зарэцкі імкнуўся да спасціжэння і адэкватнага творчага адлюстравання няпростых працэсаў грамадскага жыцця, складзенага ўнутранага святу сучасніка.

У няпросты час, калі дэфармаваліся традыцыйныя каштоўнасці і ўяўленні, пісьменніку важна было паказаць механізм супраціўлення, супрацьстаяння лёсу дзеля захавання ў душы чалавечнасці і дабрыні.

Пясняр рэвалюцыі, пісьменнік арыгінальнага таленту, М. Зарэцкі пакінуў не надта вялікую спадчыну, бо вельмі рана абарваўся яго творчы шлях. Але лепшае, што створана Зарэцкім – гэта раманы «Вязьмо», «Сцежкі-дарожкі» і шмат апавяданняў, трывала ўвайшлі ў скарбонку беларускай савецкай літаратуры.